ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1981
19
ЛІСТАПАДА
ЧАЦВЕР
№ 33 (1333)
Выходзіць раз у тыдзень
Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## ФІНІШУ ГОДА—УДАРНАЯ ПРАЦА!

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### СУСТРЭЧУ

з журналістамі-міжнароднікамі арганізаваў дэканат па рабоце з замежнымі студэнтамі факультэта журналістыкі. На пытанні студэнтаў I—IV курсаў адказалі загадчык міжнароднага аддзела газеты «Звязда» В. Ц. Вольскі, каментатар Беларускага тэлебачання В. І. Вялеська, журналіст-міжнароднік Г. К. Навіцкі.

Л. АТРУШКЕВІЧ.

### АДБЫЛОСЯ

чарговае пасяджэнне навукова-даследчага семінара кафедры лікавых метадаў і праграміравання механіка-матэматычнага факультэта. З дакладам «Інтэрпаляцыйныя аналогі метаду Чэбышава» выступілі дацэнт Н. П. Фядэнка і стажор з СРВ Хо Хак Ынг.

А. ШЫБУТ.

## СПАТКАННЕ З КРАСОЮ

Музыка — сястра паэзіі. Для філолагаў сустрэчы з ёю гэтак жа неабходныя, як і сустрэчы з жывапісам, тэатрам, архітэктурай. Але не кожны раз ёсць у студэнта магчымасць паслухаць чароўную музыку, сустрэцца з таленавітым артыстам. Таму канцэрт, што на грамадскіх асновах далі на філфаку маладыя музыканты аркестра Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР, вядомага дырыжора Яраслава Антонавіча Вашчака, стаў прыкметнай культурнай падзеяй на факультэце. Для некаторых гэта было не толькі першым непасрэдным знаёмствам з творамі сусветна вядомых кампазітараў, але і з арфаю, габоем, віяланчэллю, ксілафонам, з чыстаю, празрыстаю мелодыяй клавесіна.

Канцэрт, які быў прысвечаны 60-годдзю БДУ імя У. І. Леніна, вельмі спадабаўся ўсім. Музыка Моцарта і Вівальдзі, Равэля і Бізэ, Шумана і Бартака (дарэчы, па рашэнню ЮНЕСКА сёлета ва ўсім свеце адзначаецца 100-годдзе з дня нараджэння гэтага венгерскага кампазітара) завалодала залай, а майстэрства і тэмперамент маладых выканаўцаў Е. Баранавай, Р. Гімалетдзінава, А. Каразева, А. Правілава, Н. Салдаценкавай, В. Судноўскага, Л. Сямёнавай канчаткова пакарылі слухачоў.

П. НАВУМЕНКА,
студэнт філфака.

● НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

## І ПЯЦЬ СТУДЭНЦКІХ ГАДОЎ...

**ТОЙ, хто закончыў у свой час ВНУ, тэхнікум, сцвярджае, што студэнцкія гады — самыя лепшыя ў іх жыцці. Гэта гады самастойнага пошуку, першых рашэнняў, выбараў, гады сталення. Пяць студэнцкіх гадоў... Якое месца адведзена ім у жыцці сучаснага чалавека, у яго духоўным, фізічным, маральным развіцці! Чым, нарэшце, памятны гэты час! Напярэдадні Міжнароднага дня студэнтаў наш карэспандэнт сустрэўся са студэнтамі розных курсаў фізічнага і механіка-матэматычнага факультэтаў і пагутарыў з імі.**

**— Уладзімір Яшчук (III курс, фізфак):**

— Што я ведаў аб студэнцкім жыцці да паступлення ў БДУ? Вучыўся ў 9-м класе, калі мая сястра была першакурсніцай педінстытута. Глядзеў на яе: вучыцца чалавек на выдатна, шмат чытае, тэатры, кіно наведвае, экзамены здае — хвалюецца. Вельмі любіць будучую прафесію (зараз, ужо працуючы, усю сябе аддае школе). Сястра ў мяне матэматык, мне больш падабалася фізіка. Любіў задачы па фізіцы рашаць. А потым паступіў на фізфак.

**Аляксандр Цярэшчанка (IV курс, фізфак):**

— Нічога не любіў так, як фізіку. На першым курсе я наогул быў цалкам захоплены ёю, забыўся пра ўсё астатняе. Але і працаваў, шчыра гаворачы, на першым курсе шмат, усю дадатковую літаратуру, якую нам давалі, тамамі чытаў.

**Марына Аўсюк, Людміла Мерная (I курс, мехмат):**

— Другі месяц вучымся, а да гэтай пары не навучыліся размяркоўваць свой час, планаваць свой дзень так, каб усё паспець. Амаль кожны дзень распадаецца на дзве часткі: першая — лекцыі, практычныя заняткі на факультэце, другая частка ідзе на падрыхтоўку да практычных і семінарскіх.

**Аляксандр Цярэшчанка:**

— Вучоба — не самамэта. Вучыцца — гэта галоўнае ў тым сэнсе, што трэба атрымліваць веды, а не зубрыць, як было ў школе. Калі пра гэта забываеш, упустую марнуеш час. Асноўную ролю адводжу самаадукацыі. У нас на фізфаку, калі не будзеш займацца самаадукацыяй, не зможаш вучыцца наогул.

**Тамара Пастухова (IV курс, мехмат):**

— Студэнцкае жыццё — гэта самы бесклапотны, шчаслівы час...

**Іван Бабко (IV курс, фізфак):**

— Заўсёды жадаў стаць выкладчыкам. Да апошняй мінуты сумняваўся: куды падаваць дакументы — у педінстытут або ва універсітэт. Выбраў усё ж універсітэт, пайшоў на педагагічны паток. Пасля заканчэння з задавальненнем буду працаваць настаўнікам у сельскай школе.

**Тамара Пастухова:**

— Як ні парадаксальна, але я, напрыклад, дрэнна ўяўляю сваю будучую прафесію...

**Іван Бабко:**

— Чым будуць памятныя студэнцкія гады? Я ўсё жыццё буду памятаць тыя піянерскія лагеры, у якіх працаваў выхавацелем. У іх — мая першая педагагічная практыка.

**Іван Таўрагінскі:**

— А памятаеце, як мы ездзілі з канцэртам у падшэфную школу? Кароным нумарам праграмы быў «танец маленькіх лебедзяў» у выкананні нашых хлопцаў!

**Іван Бабко:**

— Ездзіў я потым у гэтую школу — на практыку. Пытаюся ў дзяцей:

— Памятаеце, як мы з канцэртам да вас прыязджалі?

Яны адразу:

— Іван Мікалаевіч, а вы не танцавалі «танец маленькіх лебедзяў»?

**Іван Таўрагінскі:**

— Або нашы штогадовыя дні імянінніка? Іх жа немагчыма забыць. Аднойчы на дні імянінніка нават «Боскую камедыю» паставілі. Я архангелам быў. «Словно огненный алмаз, ваш сияет левый глаз»... — маналог у мяне такі быў.

**Тамара Пастухова:**

— Ганну Натанаўну, нашага першага куратара, ніколі не забуду. Колькі разоў у час сесіі яна прыходзіла да нас у інтэрнат і рабіла кансультацыі па... любому прадмету, нават англійскую мову пераводзіла з намі.

**Святлана Гарохава (IV курс, мехмат):**

— Студэнцкае жыццё — гэта здорава!

Запісала А. ЛЫСЮК.



17 лістапада прагрэсіўная грамадскасць планеты адзначала Міжнародны дзень студэнтаў. Моладзь з 5 кантынентаў Зямлі навучаецца ў Белдзяржуніверсітэце. Студэнты ў прыўзнятым настроі сустрэлі гэта свята.
Фота В. ШАЧАКА.

● РЭПАРТАЖ

## НА ПРАСТОРЫ ЖЫЦЦЯ

НАТОЎП на другім паверсе галоўнага корпуса гудзеў, як растрывожаны вулей. Што тут робіць такая колькасць студэнтаў? За кнігамі ў бібліятэку прыйшлі? Ці канферэнцыя якая павінна адбыцца?

— У чым тут справа?— звярнуўся я да адной дзяўчыны.

Яна павярнулася і, быццам нічога не бачачы, адказала самым суровым тонам:

— Не! Толькі ў пракуратуру... толькі ў пракуратуру!

Я нават спалохаўся. Нейкая дзіўная студэнтка.

— Не звяртайце ўвагі. Сёння ў нас, юрыстаў, размеркаванне, —адказала за дзяўчыну яе сяброўка.— Таня вельмі хоча працаваць у пракуратуры. А бяруць туды ў асноўным хлопцаў. Вось яна і хвалюецца...

— А вас куды накіравалі?

— У суд, канешне. Камісія, нават не сумнявалася.

Я даведаўся, што Наташа Даўгіх мае самы высокі бал і ў Міністэрства юстыцыі пайшла па жаданню. Спачатку яна закончыла тэхнікум. Потым працавала. На юрфак паступіла таму, што добра ведала і цікавілася працоўным правам. Зараз Наташа — кандыдат у народныя суддзі...

У гэты час дзверы аўдыторыі, дзе знаходзілася камісія па размеркаванню, адчыніліся...

— Ой, здорава!— дзяўчына выпархнула з аўдыторыі. — Я заяўляю: «У суд хачу». А яны: «Нельга. Табе толькі 23 гады, а трэба мінімум 25». У мяне аж ногі падкасіліся. Тады дэкан кажа: «Мо зробіце выключэнне, возьмеце на стажыроўку?» І ўзялі!

Люда Пазнякова, як і большасць дзяўчат факультэта, марыла працаваць суддзёй. А бяруць толькі 40 чалавек. Ёй пашанцавала.

— Люда, вось ты радуешся... А не сумна развітвацца з універсітэтам?

— Яшчэ як сумна. Учора здалі апошні экзамен па тэорыі дзяржавы і права. Мабыць, першы экзамен у жыцці, які хацелася здаваць і здаваць... А на апошняй лекцыі некаторыя дзяўчаты нават плакалі... Адчувалася, што пражылі ўжо нейкі кавалак часу... Сёння ў нас будзе вечар апошняга званка. Усе хвалююцца...

Вось так і заўсёды. Празвініць апошні званок — і пайшлі ў свет маладыя следчыя, адвакаты, юрысконсульты... За іх спіной пяць гадоў насычанага студэнцкага жыцця, пяць гадоў вучобы. А наперадзе — праца, праца нялёгкая, адказная, цікавая.

**КАМЕНТАРЫЙ ІОСІФА АЛЯКСАНДРАВІЧА ЮХО,** члена камісіі па размеркаванню:

— Тэарэтычна выпускнікі падрыхтаваны добра. А вопыт прыйдзе з практыкай. У гэтым годзе мы накіравалі ў Міністэрства юстыцыі 40 чалавек, у пракуратуру — 25, у Міністэрства сельскай гаспадаркі — 23. Частка студэнтаў паехала працаваць юрысконсультамі ў калгасы, саўгасы... Некалькі чалавек атрымалі свабодныя дыпломы. Мне думаецца, сёлета юрфак выпусціў не горшых спецыялістаў, чым у мінулыя гады.

...На выхадзе з універсітэта я ўбачыў Таню, якая так жадала пайсці працаваць у пракуратуру, што не звярнула ўвагі на маё пытанне. Яна смяялася...

У. ДАШУК.

● У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ — ГРАМАДСКІЯ НАВУКІ

# ДЫЯПАЗОН ТВОРЧАСЦІ

*Пытанні, звязаныя з далейшым паляпшэннем выкладання грамадскіх навук, камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі, развіццём даследаванняў актуальных праблем марксісцка-ленінскай тэорыі ў святле рашэнняў XXVI з'езда КПСС былі ў цэнтры ўвагі Усесаюзнай нарады загадчыкаў кафедраў грамадскіх навук, якая праходзіла ў кастрычніку ў Вялікім Крамлёўскім палацы. У рабоце нарады прынялі ўдзел прадстаўнікі нашага універсітэта: дырэктар ІПК выкладчыкаў грамадскіх навук пры БДУ імя У. І. Леніна, загадчык кафедры гісторыі КПСС прафесар А. Д. Малочка, загадчык кафедры палітэканоміі ІПК прафесар У. П. Увараў, загадчык кафедры навуковага камунізму ІПК прафесар А. Д. Гусеў, загадчык кафедры навуковага камунізму дацэнт П. П. Дронь, загадчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў прафесар І. І. Жбанкова, загадчык кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў прафесар Т. І. Прытыцкая, загадчык кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў прафесар У. М. Сікорскі, загадчык кафедры гісторыі філасофіі і логікі прафесар А. С. Кляўчэня, загадчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў прафесар В. С. Сцёпін, загадчык кафедры палітэканоміі гуманітарных факультэтаў прафесар С. Я. Янчанка.*

*Прапануем чытачам артыкул дырэктара ІПК А. Д. Малочкі, прысвечаны аднаму з пытанняў, што абмяркоўваліся на Усесаюзнай нарадзе загадчыкаў кафедраў грамадскіх навук.*

ПРАЙШЛО нямногім больш паўгода з часу работы XXVI з'езда КПСС, а вялікая роля яго гістарычных рашэнняў, якія натхняюць і мабілізуюць, праяўляецца з усё нарастаючай сілай. У Справаздачным дакладзе ЦК КПСС з'езду таварыш Л. І. Брэжнеў, адзначыўшы дасягнутыя поспехі савецкай сістэмы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, адначасова звярнуў увагу на неабходнасць яе карэннага паляпшэння, пад якім маецца на ўвазе перш за ўсё якасць выкладання. Рашэнне гэтай задачы, ідэйна-тэарэтычная накіраванасць, узровень выкладання наогул, як гэта неаднаразова падкрэсліваў У. І. Ленін, цалкам вызначаюцца саставам лектараў.

Вучыцца патрэбна ўсё жыццё. «Гэта старая ісціна,— указваў Л. І. Брэжнеў,— прымяніма ва ўсім. Але, бадай, больш за ўсё яна датычыцца тых, хто вучыць іншых». Гэтыя словы ў поўнай меры прымянімы і да ўсіх грамадазнаўцаў ВНУ.

Вялікую ролю ў павышэнні іх тээрэтычнага ўзроўню і педагагічнага майстэрства адыгрывае створаная ў краіне і паспяхова дзейнічаючая ўжо шэраг гадоў сістэма павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук. І я, відаць, не памылюся, калі адзначу, што ў гэтай сістэме вядучае месца займаюць інстытуты павышэння кваліфікацыі грамадазнаўцаў вышэйшай школы пры дзяржаўных універсітэтах. За апошнія пяць гадоў у іх павысілі свой тэарэтычны ўзровень і педагагічнае майстэрства многія тысячы выкладчыкаў. Толькі ў нашым ІПК за 8 гадоў яго існавання прайшло перападрыхтоўку каля 3 тысяч чалавек.

Значэнне інстытута павышэння кваліфікацыі вызначаецца не толькі колькасцю прайшоўшых праз іх выкладчыкаў, але перш за ўсё зместам іх дзейнасці, у якім павышэнне навуковага ўзроўню слухачоў з'яўляецца вядучым. Змест гэтай работы зараз вызначаецца задачамі грамадскіх навук, якія сфармуляваны ў дакументах і матэрыялах XXVI з'езда КПСС.

На першым плане стаяць тэарэтычнае асэнсаванне і тэарэтычная распрацоўка праблем камуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне. У гэтым нам аказваюць вялікую дапамогу свaімі лекцыямі вядомыя вучоныя з Масквы, Ленінграда, Кіева.

Сучасны этап існавання двух сацыяльных сістэм характарызуецца прыкметным абвастрэннем ідэалагічнай барацьбы. Рашучы, аргументаваны адпор варожым канцэпцыям — неабходная складаная частка выкладання пастаўленай XXVI з'ездам КПСС задачы сістэматычнага выкрыцця буржуазных і рэвізіяністкіх фальсіфікацый марксізму-ленінізму. Кафедры нашага інстытута аказваюць дапамогу слухачам у выкананні гэтай актуальнай задачы. Выкладчыкі ІПК падрыхтавалі і чытаюць 25 праблемных лекцый і спецкурсаў, прысвечаных крытыцы сучаснай буржуазнай ідэалогіі, рэфармізму і рэвізіянізму. Пры гэтым асаблівая ўвага звяртаецца на метадалагічныя і метадычныя пытанні забеспячэння аргументаванага выкрыцця і наступлення на ідэалогію і палітыку імперыялізму ў канкрэтных сучасных умовах. Мы пастаянна вывучаем назапашаны ў гэтай галіне вопыт на кафедрах ВНУ і ўсё каштоўнае прапагандуем сярод выкладчыкаў. Так, кафедра палітэканоміі, абагульніўшы вопыт шэрагу ВНУ рэспублікі, склала метадычныя рэкамендацыі «Аб павышэнні дзейснасці крытыкі антымарксісцкіх эканамічных тэорый у курсе палітычнай эканоміі ў святле патрабаванняў XXVI з'езда партыі». Яны адобраны калегіяй Мінвуза БССР і накіраваны ў ВНУ рэспублікі. Разам з тым патрэбна сказаць, што ў даным пытанні маюць патрэбу ў дапамозе і выкладчыкі ІПК. Мы хацелі б бачыць па гэтых праблемах больш публікацый у нашых цэнтральных філасофскіх, эканамічных і іншых часопісах.

У дакладзе на мінулай Усесаюзнай нарадзе загадчыкаў кафедраў прыродазнаўчых навук сакратар ЦК КПСС таварыш М. В. Зімянін падкрэсліў неабходнасць зрабіць ІПК «навукова-метадычнымі цэнтрамі з базай назапашання перадавога вопыту вышэйшай школы і павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў». Над ажыццяўленнем гэтых указанняў з вялікай настойлівасцю працуе і калектыў нашага інстытута.

За апошнія 5 гадоў ІПК выдаў 20 навукова-метадычных дапаможнікаў. Гэта калектыўныя працы кафедраў ІПК. У іх падрыхтоўцы актыўна ўдзельнічала звыш 300 слухачоў з многіх ВНУ краіны. У бліжэйшы час выходзяць з друку падрыхтаваныя выкладчыкамі і слухачамі ІПК чатыры навукова-метадычныя зборнікі ў дапамогу выкладчыкам гісторыі КПСС, філасофіі, палітэканоміі і навуковага камунізму па вывучэнню матэрыялаў XXVI з'езда КПСС.

Дзякуючы сістэматычнай дапамозе з боку ЦК КПБ, Мінскага гаркома і абкома партыі намі арганізуюцца рэгулярныя выступленні перад слухачамі кіруючых работнікаў рэспублікі, дэлегатаў XXVI з'езда КПСС, ветэранаў вайны і працы, дзеячаў літаратуры і мастацтва.

У нас устанавіліся цесныя сувязі са слухачамі, якія пабылі ў ІПК. Яны нам пішуць, звяртаюцца за парадамі. Вось, напрыклад, што напісала загадчыца кафедры гісторыі КПСС Омскага чыгуначнага інстытута дацэнт Н. І. Семкіна: «Вось цяпер, калі прайшлі тры месяцы пасля ІПК, асабліва ясна бачна, як добра ён робіць сваю справу. Матэрыял, атрыманы ў вас, «працуе». Працуе ён і ў выкладанні, і ў публічных лекцыях, і ў кіраўніцтве прапагандысцкай работай». Такія пісьмы з'яўляюцца, натуральна, самай высокай узнагародай за нашу нялёгкую, але ўдзячную працу. Яны дающь падставу сказаць, што калектыў нашага інстытута зробіць усё для безумоўнага выканання задач, якія стаяць перад намі.

**А. МАЛОЧКА,**
**дырэктар Інстытута павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук пры Беларускім дзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна, прафесар.**

# САРДЭЧНА ВІНШУЕМ!

Абаранілі кандыдацкія дысертацыі:

**СЯРГЕЙ СЯРГЕЕВІЧ ВЯТОХІН** — фізічны факультэт, кафедра агульнай фізікі, навуковы кіраўнік прафесар **А. М. Саржэўскі;**

**УЛАДЗІМІР МІКАЛАЕВІЧ НАВУМЧЫК**—фізічны факультэт, кафедра агульнай фізікі, навуковы кіраўнік прафесар **А. М. Саржэўскі;**

**ТАЦЦЯНА АЛЯКСАНДРАЎНА КАЛЕВІЧ** — НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі, навуковыя кіраўнікі прафесар **С. А. Умрэйка**, старшы навуковы супрацоўнік **Л. В. Кобец;**

**ТАМАРА ІВАНАЎНА КОЛЬЧАНКА** — фізічны факультэт, кафедра фізікі паўправаднікоў, навуковы кіраўнік дацэнт **У. М. Ламака;**

**НАТАЛЛЯ УЛАДЗІМІРАЎНА МАНОХІНА** — біялагічны факультэт, кафедра заалогіі, навуковы кіраўнік дацэнт **В. Ф. Цераховіч;**

**СЯРГЕЙ АЛЯКСАНДРАВІЧ КРАЦЬКО**—НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі, навуковы кіраўнік прафесар **І. Р. Некрашэвіч;**

**АХМЕД САГАЙДУ МАЙГА** — фізічны факультэт, кафедра фізічнай оптыкі, навуковы кіраўнік дацэнт **В. Я. Гракаў;**

**РЫГОР РЫГОРАВІЧ ФЕДАРУК** — НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі, навуковыя кіраўнікі старшы навуковы супрацоўнік **І. З. Рутковскі**, дацэнт **В. Ф. Стэльмах;**

**ЮРЫЙ ЛЕАНІДАВІЧ ГРУЗІЦКІ** — кафедра гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў, навуковы кіраўнік прафесар **У. М. Сікорскі.**



**Вялікую выхаваўчую работу сярод студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта праводзіць савет ветэранаў вайны.**

**НА ЗДЫМКУ: група ветэранаў вайны—старшыня універсітэцкага камітэта ДТСААФ М. В. Гарлатаў, старшыня савета ветэранаў вайны універсітэта, дацэнт І. В. Марчанка, прафесар А. А. Галаўко, Герой Савецкага Саюза прафесар Д. М. Жмуроўскі і старшы выкладчык М. Я. Зайцаў — абмяркоўваюць рашэнні V Усесаюзнай канферэнцыі ветэранаў вайны і задачы грамадскасці універсітэта па іх выкананню.**

**Фота В. ШАЧАКА.**

# Сустракаем юбілей

ХУТКА БУДЗЕ адзначаць 60-годдзе наш універсітэт, адна з буйнейшых у рэспубліцы вышэйшых навучальных устаноў. Поўным ходам ідзе падрыхтоўка да свята. Нямала слаўных пачынанняў, добрых спраў прысвячаецца гэтай даце.

Вось нядаўна ў незвычайна ўрачыстай абстаноўцы прайшоў вечар на факультэце журналістыкі. Святочна прыбраная зала, запоўненая студэнтамі, гасцямі. З цёплых віншавальных слоў пачынае сваё выступленне дэкан факультэта, доктар філалагічных навук П. І. Ткачоў. Ён расказаў пра тое, з чаго пачынаў наш універсітэт, як расцiў уласныя кадры выкладчыкаў, якое велізарнае значэнне мае зараз у справе падрыхтоўкі кваліфікаваных спецыялістаў. І вельмі радасна, што факультэт журналістыкі стаў кузняй літаратурна-творчых работнікаў рэспублікі. Ім, былым выпускнікам, а зараз шырока вядомым у Беларусі культурным дзеячам, і было прадастаўлена наступнае слова.

Пра свой шлях у кінематаграфію, пра творчыя планы на будучае расказаў кінарэжысёр І. Дабралюбаў. Перад студэнтамі выступіў спартыўны журналіст У. Глод. Ён выказаў упэўненасць, што універсітэт не здасць сваіх пазіцый, а будзе крочыць наперад да новых рубяжоў.

Многае пра свае прафесійныя пачынанні, пра вучобу першых пакаленняў беларускіх журналістаў расказала прафесар Е. Л. Бондарава, якая 30 гадоў назад закончыла факультэт, а зараз аддае веды сённяшнім яго студэнтам.

Выступаючыя падкрэслілі шматлікія дасягненні БДУ за 60-гадовы перыяд існавання, пажадалі тым, хто хутка будзе з гонарам насіць універсітэцкі ромбік, не толькі добрымі поспехамі ў вучобе, а і стваральнай працай пацвердзіць званне выхаванца БДУ.

Вельмі знамянальна, што на святочны вечар да беларускіх журналістаў прыехалі іх калегі і сябры, студэнты журфака Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта імя Т. Р. Шаўчэнкі. У зале гучалі ўкраінскія вершы, народныя песні і зноў яна віншаванні, пажаданні ад братоў і сясцёр з сонечнай Украіны.

Свята завяршылася канцэртам мастацкай самадзейнасці. Тут выступілі не толькі савецкія юнакі і дзяўчаты, але і замежныя студэнты, для якіх БДУ стаў месцам набыцця грунтоўных ведаў, а наша сінявокая Беларусь — гасцінным домам.

З прывітаннямі і песнямі прыйшлі на святочны вечар нашы малодшыя браты і сёстры — школьнікі сталіцы, удзельнікі хору Рэспубліканскага Палаца піянераў.

Светлыя гады студэнцтва, будзьце такімі шчаслівымі, радаснымі, як піянерскія песні, як наша заўтра. Да новых перамог, універсітэт-юбіляр!

**А. ГРЫШКЕВІЧ,**
**студэнтка журфака.**

● СПРАВЫ ПРАФСАЮЗНЫЯ

# Актывізавалі дзейнасць

АСНОЎНАЯ задача вытворча-масавай камісіі—арганізацыя сацыялістычнага спаборніцтва ў маштабе Белдзяржуніверсітэта і ў аказанні дапамогі рэктарату і парткому ў рашэнні найбольш важных пытанняў вытворчага характару.

У цяперашні час у састаў вытворча-масавай камісіі ўключана 6 членаў мясцкома і 9 прадстаўнікоў з ліку прафсаюзнага актыву факультэтаў і падраздзяленняў БДУ. У гэтым годзе ўпершыню ў саставе камісіі створаны сектары па асноўных напрамках работы. Так, напрыклад, створаны сектар навукова-даследчай работы, які ўзначаліў прафесар У. П. Гольцаў. Сектар вучэбна-метадычнай работы ўзначаліў прафесар А. С. Кляўчэня. Створаны таксама сектар, які будзе спецыяльна займацца пытаннямі арганізацыі сацспаборніцтва. Гэты сектар узначаліў кандыдат гістарычных навук В. М. Пісараў.

Працягваецца работа над новым агульнауніверсітэцкім палажэннем аб сацыялістычным спаборніцтве. Як вядома, праект гэтага палажэння быў раней апублікаваны ў газеце «Беларускі універсітэт». Намі атрымана шмат прапаноў па яго паляпшэнню. Асноўная праблема заключаецца ў тым, каб новым палажэннем былі ахоплены не толькі факультэты, але і ўсе іншыя падраздзяленні БДУ. У сувязі з тым, што распрацоўка новага палажэння яшчэ не закончана, вынікі сацспаборніцтва паміж факультэтамі ў гэтым годзе будуць падводзіць па палажэнню, якое існуе.

Спынімся на пытанні выканання прынятых сацабавязацельстваў. На жаль, можна канстатаваць, што па шэрагу важнейшых паказчыкаў складваецца неспрыяльная сітуацыя. Ёсць апасенне за выкананне такога важнага пункта, як колькасць пададзеных заяў на вынаходніцтвы. Напрыклад, фізічнаму факультэту трэба падаць да канца года яшчэ 23 заявы, а НДІ ФХП — 11. Хацелася б верыць, што ў год 60-годдзя БДУ усе выкладчыкі і супрацоўнікі прыкладуць максімум намаганняў, каб з гонарам выканаць прынятыя сацыялістычныя абавязацельствы.

**Г. МАЦВЕЕЎ,**
**старшыня вытворча - масавай камісіі мясцкома, дацэнт.**




**ХІМІЧНЫ факультэт святкуе 50-годдзе свайго нараджэння. 13 лістапада ў памяшканні клуба імя Дзяржынскага адбыўся ўрачысты сход. У прэзідыуме — вядомыя вучоныя, гонар сучаснай хімічнай навукі. А ў зале — госці. Выпускнікі хімфака, яны з'ехаліся сюды з усіх куткоў краіны. Новыя сустрэчы, новыя знаёмствы... А потым студэнцкі тэатр факультэта паказаў цікавую канцэртную праграму «Хімфак учора, сёння, заўтра».**





# ЗНАЧНЫ КРОК НАПЕРАД

● ГАРЫЗОНТЫ КАФЕДРЫ

У СУВЯЗІ са святкаваннем 60-гадовага юбілею універсітэта кафедра крымінальнага права на адным са сваіх пасяджэнняў падвяла некаторыя вынікі работы за апошнія 10 гадоў. За гэты час зроблена шмат.

Члены кафедры ўдзялілі вялікую ўвагу тэарэтычнай распрацоўцы крымінальна-прававых праблем барацьбы са злачыннасцю, спалучаючы юрыдычны аналіз дзейнічаючага крымінальнага заканадаўства з навуковым абагульненнем судовай практыкі і дачай практычных рэкамендацый па далейшаму ўдасканаленню крымінальна-прававых норм і павышэнню якасці работы органаў пракуратуры і суда.

Прафесар І. І. Гарэлік, вывучаючы праблему сувязі крымінальнага права і навукова - тэхнічнага прагрэсу, тэарэтычна абгрунтаваў межы крымінальна-прававога ўмяшання пры парушэннях правілаў тэхнічнай бяспекі. Ён упершыню ў савецкай прававой літаратуры разгледзеў прававыя аспекты перасадкі органаў і тканак і сфармуляваў прапановы аб распрацоўцы і канкрэтным змесце нарматыўнага акта аб лячэнні шляхам алатрансплантацыі. І. І. Гарэлік таксама даследаваў уплыў стану ап'янення на прававую ацэнку грамадска небяспечных дзеянняў, зробленых у такім стане. Па' гэтых праблемах І. І. Гарэлікам апублікавана 5 манаграфій і шэраг артыкулаў.

Супрацоўнікі кафедры прааналізавалі практыку Вярхоўнага суда БССР і іншых судоў рэспублікі, абагульніўшы вынікі гэтай работы ў сваіх манаграфіях па данай тэматыцы (выдадзены ў 1973, 1976 гг., трэцяя выйдзе ў свет у 1982 годзе). Такое даследаванне ў Беларусі зроблена ўпершыню. Яно, несумненна, садзейнічае ліквідацыі некаторых недахопаў, якія дапускаюцца судамі пры прымяненні норм крымінальнага права, разнабою ў іх тлумачэнні работнікамі праваахоўных органаў.

Дацэнт П. А. Дубавец займаўся даследаваннем прававых пытанняў барацьбы з п'янствам і алкагалізмам. У апублікаваных па гэтай праблеме манаграфіі і іншых навуковых працах унёс шэраг прапаноў па ўдасканаленню адпаведных юрыдычных норм і практыкі іх прымянення.

Важнае значэнне для развіцця юрыдычнай навукі мае выдадзеная ў 1977 годзе манаграфія прафесара М. А. Яфімава і дацэнта В. А. Шкурко «Рэцыдыўная злачыннасць і яе папярэджанне».

Забеспячэнню правільнага прымянення новых або істотна змененых у апошнія гады норм КК БССР садзейнічае навуковы аналіз, які далі гэтыя ж аўтары ў манаграфіі, што выйшла ў 1980 годзе.

Старшы выкладчык, кандыдат юрыдычных навук А. В. Баркоў упершыню ў прававой літаратуры даў тлумачэнне існавання ў крымінальным заканадаўстве самастойнага прававога інстытута сродкаў, якія стымулююць раскрыццё злачынстваў, выявіў агульныя рысы і асаблівасці крымінальна-прававых норм, якія ствараюць гэты інстытут, унёс прапановы па іх далейшаму ўдасканаленню з улікам вопыту сацыялістычных краін. Па гэтай праблеме ім у мінулым годзе апублікавана манаграфія.

Прынята да апублікавання і выйдзе ў свет у бліжэйшы час манаграфія старшага выкладчыка, кандыдата юрыдычных навук В. М. Хоміча, у якой разгледжаны пытанні крымінальнай адказнасці за ўгон транспартных сродкаў.

Кафедра падтрымлівае цесную сувязь з оргамамі суда, пракуратуры, МУС. Гэта выражаецца, у прыватнасці, ва ўдзеле выкладчыкаў у навукова-кансультатыўных і метадычных саветах гэтых органаў, у сумеснай распрацоўцы з імі (і абмеркаванні) праектаў нарматыўных актаў, Звода законаў БССР, пастаноў пленумаў Вярхоўнага суда БССР, у састаўленні і рэдагаванні выдаваемых гэтым судом «Аглядаў судовай практыкі». Юрысты - практыкі прыцягваюцца да ўдзелу ў навуковай рабоце кафедры.

Практычным работнікам аказваецца дапамога ў падрыхтоўцы кандыдацкіх дысертацый. Кафедра мае ўсе падставы ганарыцца маладой зменай, якая добра зарэкамендавала сябе ў выкладчыцкай рабоце і актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці універсітэта.

На пасяджэннях кафедры рэгулярна абмяркоўваюцца пытанні методыкі выкладання, праводзяцца лекцыі з наступным іх абмеркаваннем, што вельмі важна для ўсіх, асабліва маладых выкладчыкаў.

Вялікае значэнне надаецца навукова-даследчай рабоце студэнтаў. Пры кафедры працуюць навуковыя гурткі, рэгулярна прадстаўляюцца лепшыя навуковыя работы студэнтаў на ўсесаюзны і рэспубліканскі конкурсы або ў выглядзе дакладаў яны рэкамендуюцца на канферэнцыі БДУ і іншых ВНУ. Работа студэнткі Т. Н. Гірсёнак «Прававыя пытанні донарства крыві» апублікавана ў агульнасаюзным часопісе «Правазнаўства».

Членам навуковых гурткоў і іншым студэнтам аказваецца метадычная дапамога ў падрыхтоўцы лекцый па пытаннях права для насельніцтва. Для чытання гэтых лекцый выкарыстоўваецца знаходжанне студэнтаў на вучэбнай і вытворчай практыцы.

У апошні час па ўказаннях рэктарата і дэканата мы сталі больш увагі ўдзяляць прафарыентацыі выпускнікоў сярэдніх школ для больш шырокага прыцягнення іх да ўдзелу ў конкурсе на паступленне ва універсітэт.

Усе члены кафедры маюць пастаянныя грамадскія даручэнні і добрасумленна іх выконваюць. Па ініцыятыве І. І. Гарэліка на факультэце створана і паспяхова працуе пад яго кіраўніцтвам група «Пошук», адкрыта мемарыяльная дошка са спісам студэнтаў і выкладчыкаў Мінскага юрыдычнага інстытута, якія загінулі пры абароне Радзімы ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Падводзячы вынікі працы за дзесяцігоддзе, мы бачым, што ў рабоце кафедры ёсць і недахопы, што яшчэ шмат прадстаіць зрабіць. У прыватнасці, усё яшчэ мала ўдзяляецца ўвагі тэхнічным сродкам навучання. Выкарыстоўваюцца не ўсе магчымасці для актывізацыі самастойнай работы студэнтаў—вячэрнікаў і завочнікаў. Шырэй належыць прыцягваць іх у навукова-даследчую работу.

**І. С. ЦІШКЕВІЧ,**
**загадчык кафедры крымінальнага права, прафесар.**

# РУЖОВЫ РАНАК

ЛІТАРАТУРНАЯ СТАРОНКА

## НОВЫЯ ТВОРЫ ЧЛЕНАЎ ЛІТАБ'ЯДНАННЯ «УЗЛЁТ»

### МІХАСЬ КАРПЕЧАНКА

* * *

Зваліцца ў травы
І забыцца
На чысціню тваіх
Вачэй.
О, Беларусь мая, крынічка,
У свеце не знайсці цябе
Мілей!

* * *

П. Н.

Табе стварaць мой небасхіл настрою
Над вечарамі смутку і трывог.
Табе дарыць мне радасці спакою
І сустракаць з усіх маіх дарог.

### СЯРГЕЙ ЧЫГРЫН

#### МОЙ ПЕРОН

Мой перон — бацькоўская хата,
Вяшчун спагады, сонца і дабра.
Люблю глядзець, калі заўжды на свята
Гараць кастры Купалля, як зара.
Люблю з бярозай моўчкі паспрачацца,
Далонню прытуліцца да расы.
Бацькоўскі двор — майго світання станцыя:
Знаёмыя аблічы, галасы...
Сланечнікі да сонейка ўзыходзяць,
Паветра пахне хлебам і травой...
Мой перон мяне заве ў госці,
Каб не застацца аднаму з журбой.

* * *

Хай жыве мая памяць, хай жыве
Аб табе, аб тваім каханні,
Аблачынкаю лёгкай плыве
І ўвечары, і ў ранні.
Хай жыве — не трывож, не чапай,
Адбуяла ўсё белым маем.
І кахання майго цяпер не чакай —
Не кахае яно, не кахае.

#### ВЕТЭРАН

Снарады,
кулі,
міны...
Хачу заснуць і не засну,
Штодзённа,
Штохвілінна,
Як спружына,—памяць пра вайну.

### СЯРГЕЙ КАВАЛЁЎ

* * *

І плакаў дождж, і трызніў ноч,
Мы з безнадзейнымі вачамі
Стаялі мокрыя ад слёз
І, ледзь знаёмыя, маўчалі.

Нам плакаў дождж... Нашто казаць:
Пачуцці ў словы пераводзіць,
Калі ўсё жыццё губляць,
Што сёння выпала, знаходзіць?!
Цябе ніколі не сустрэць,
Калі сустрэць — сустрэць чужую.
Таму сумую па табе,
Таму па ночы дождж сумуе.

* * *

Я бачыў рукі матулі,
Якія зброю ўмела трымалі.
Я бачыў рукі матулі,
Што горад з руін узнімалі.
Я бачыў рукі матулі,
Якія ўнукаў ласкалі...
Не,
Я не бачыў рук матулі,
Якія б адпачывалі.

* * *

Жыву я паўнапраўна у сталіцы,
Віруе звыклы будняў карагод,
А мне ўсё роўна часта, часта сніцца
Блакіт крыштальны свіцязянскіх вод.

Вось на світанку маці йдзе па дровы.
Птушыны спеў даносіцца з палёў.
А вось сусед працяжнае: «Каровы!»,
Прайшоўшы з пугай вуліцай, завёў.

І бацька багатырскаю паходкай
Абходзіць гаспадарліва палі,
Аб нечым перамовіліся цёткі,
Вады набралі хутка і пайшлі.

Світаннем абудзіліся хаціны,
Выплёўваючы дымныя клубы.
Туманная рассеялася ціна
І вырастаюць волаты-слупы.

Бягу я басяком расой імклівa,
А сонца, нібы яркі парасон.

### ТАЦЦЯНА МАРЧЫК

Я адкрываю вочы палахліва —
Кудысьці знік мой непаўторны сон.

На яве сонца зазірае ў вочы,
Віруе горад звыкласцю гудкоў.
А я чакаю нецярпліва ночы,
Каб на радзіму мне вярнуцца зноў.

* * *

Пакрысе адступаюць дрымоты,
Пра цябе я забыцца хачу.
Ды з палону сухой адзіноты
Да цябе зноў праз памяць лячу.
Не скажу больш табе, што кахаю,
Хоць змаўкаю ўладна журбе.
Хоць балючасцю сэрца сціскае,
Калі стрэну раптоўна цябе.
Шкадаваць, што сустрэла нас ростань,
Я не буду, не крыкну: пастой!—
А скажу толькі шчыра і проста:
Мне было вельмі добра з табой.

### ВОЛЬГА САВАСЦЮК

* * *

А на лістах пажоўклых дожджык скача,
Упала неба ў воблачны мяшок,
Акно ў маім пакоі нават плача,
Што летні больш не выдасца дзянёк.
А я не плачу, лета адшумела
І ўсё былое разам адышло.
І ўжо на зіму восень прыляцела,
Махае каляровым мне крылом.
І я хусцінкай восені махаю,
Не ўплятай мне павуцінкі ў валасы.
Я часу шмат яшчэ ў запасе маю,
Прабач, не трэба гэтай мне красы.

### МІКОЛА ХАУСТОВІЧ

* * *

Ты раптам паяўляешся зноў,
Як зорка, плывеш на світанні,
І цяжка мне моваю слоў
Сягоння прызнацца ў каханні.

Баюся струну закрануць,
Ці прымеш яе ты гучанне?
Ці праўду табе прапяюць? —
Баюся прызнацца ў каханні.

Нібы ад пякучага «не»
Надзею гублю ў акіяне.
Таму так боязна мне
Сягоння прызнацца ў каханні.

* * *

Я зорку шукаю сваю
Гадзінамі ў небе начным.
Нязгодны са шчасцем зямным:
Я зорку шукаю сваю.
Зямное не вабіць нічым,
Сярод летуценняў жыву.
Я зорку шукаю сваю
Гадзінамі ў небе начным.

* * *

Бярозу здзіраю, як Несцер стары,
Праславіць бярозу жадаю,
Усё лепшае я выбіраю.

* * *

Бярозу здзіраю, як Несцер стары.
І слёзы цякуць па бярозавым гаі,
Бо слава не трэба ствалам без кары:
Бярозу здзіраю, як Несцер стары,
Праславіць бярозу жадаю.

### ТАЦЦЯНА КАВАЛЕНКА

## СПАДАРОЖНІЦА

А зіма плакала за вокнамі электрычкі. Усе ўжо забыліся, што бязлітаснаю і злою можа быць яна. Як не забыцца, калі пра снег і мароз і ўспамінаў няма, а ўсюды толькі кроплі-слёзы. Людзі ж былі заклапочаны сваімі справамі. Яны не бачылі таго, што рабілася побач: мая спадарожніца, якая да гэтага часу сядзела вельмі сумная і маўклівая, дастала лісток, разгарнула яго. Міжволі я прачытала: «Тэлеграма. Вяртайся хутчэй. Тата ў цяжкім стане. Мама». Лісток дрыжаў. Больш нічога. Як хацелася б зараз даведацца пра ўсё-ўсё! Мая незнаёмка! Мне таксама баліць сэрца, вельмі баліць, і ніхто пра гэта не ведае. Я расказала б табе, чаму. Нам бы зрабілася лягчэй, калі б мы падзяліліся горам. Магчыма, так, але я не маю права кранацца за балючае, бо не ўпэўнена, што суцішу боль. Я вымушана маўчаць, хаця чую, як колы выстукваюць: «Бяда, бяда. Бяда, бяда», хаця ведаю, чаму плача зіма. Зараз электрычка будзе ў Мінску. Людзі разыдуцца, нічога не ведаючы. А што здарыцца сённяшняй ноччу? Ну, чаму так павольна рухаецца цягнік? Табе ж трэба спяшацца, табе ж трэба паспець! Дзяўчына маўчала. І раптам сярод слёз і суму прагучаў вясёлы, звонкі бяскрыўдны смех дзіцяці. Гэта быў сімвал перамогі дабра над злом, жыцця над смерцю, смеху над слязамі. Спадарожніца ўзняла галаву, і ў вачах заблакітнеў колер надзеі. Хай сабе плача зіма, але, наперакор ёй, будзе вечна існаваць дзіцячы смех. Хай кладуцца на плечы чалавека любыя выпрабаванні, але не загіне надзея на лепшае, воля застанецца непахіснай, любоў да жыцця не астыне. Ці не ў гэтым неўміручасць?

### ГАННА ВЯЗІЦКАЯ

Чакаю пісьма, чакаю
З надзеяю, што напішаш.
А вецер вішні гайдае
І травы на лузе калыша.
Па сцежках лёгка гуляе,
Дзе сны з табою хадзілі.
А лета тыдні губляе
І сум наганяюць лівні.
Не пішаш... Чаму? Ці можа
Пісьмо тваё ў дарозе?..
А сэрцу ў грудзях трывожна,
Нібы ў цёмным астрозе.

* * *

Трэба жыць — не існаваць,
Па-сур'ёзнаму жыць трэба.
Каб нечым новым загучаць,
А не пустым, бяздарным рэхам.



«Папрашайка». Фотаэцюд В. ШАЧАКА.


## АБ'ЯВА

З 5 лістапада працуе студэнцкае кафэ «Гаудэамус». Час работы: з 19.00 да 23.00. Выхадны дзень — панядзелак.

Білеты прадаюцца ў студэнцкім клубе (гал. корпус, аўд. 401) штодзённа з 12.00 да 16.00. Прымаюцца калектыўныя заяўкі.

У арганізацыі культурнай праграмы прымаюць удзел вакальна-інструментальны ансамбль, дыскаклуб, танцавальная група «Арніка», слайдклуб, калектывы мастацкай самадзейнасці факультэтаў.

Аб часе работы секцый можна будзе даведацца з аб'яў у фае кафэ.

ПРАФКОМ, КАМІТЭТ КАМСАМОЛА



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

19 лістапада 1981 г.

Заказ 1831 АТ 00807



220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.



Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ